# З НОВЫМ ГОДАМ, СЯБРЫ!

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1986
25
СНЕЖНЯ
ЧАЦВЕР
№ 35 (1521)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

## Беларускі універсітэт ТЭЛЕТАЙП

*УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА*

### ДЭЛЕГАЦЫЯ

Вільнюскага універсітэта на чале з рэктарам І. П. Кубілюсам гасціла ў БДУ. Былі абмеркаваны вынікі сацыялістычнага спаборніцтва паміж універсітэтамі за 1986 год, планы супрацоўніцтва на будучы, падпісана дамоўленасць аб супрацоўніцтве і сацыялістычным спаборніцтве на бягучую пяцігодку.

В. АЛЕНІНА.

### СУСТРЭЧА

з творчай групай стваральнікаў фільма «Плюмбум, ці Небяспечная гульня» адбылася ва універсітэце. Дэманстраваўся фільм.

А. САЎЧЫК.

### ПЛЕНУМ

камітэта камсамола універсітэта абмеркаваў задачы камсамольскай арганізацыі па актывізацыі барацьбы з праявамі чужой ідэалогіі і маралі.

А. САВІЧ.

### ВЫНІКІ

сацыялістычнага спаборніцтва за 1986 год падведзены ва універсітэце. Адзначана, што выкананы план выпуску спецыялістаў, абаронена 6 доктарскіх дысертацый супраць запланаваных 5-ці, падрыхтавана 6 майстроў і 28 кандыдатаў у майстры спорту, выдадзена 25 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў.

А. СЦЯПАНАЎ.

### АДБЫЛОСЯ

пасяджэнне дыскусійна-інтэрнацыянальнага клуба «Палітыкус» на тэму «ЗША — сёння». У дыскусіі прымаў удзел аспірант-стажор з ЗША Дэвід Свансан.

П. САШЫН.

### 27 СНЕЖНЯ

адбудзецца вечар, прысвечаны XXII гадавіне ўтварэння НДПА і VII гадавіне новага этапа Красавіцкай рэвалюцыі ў Афганістане. Вечар пачнецца ў 18.30 і пройдзе ў актавай зале галоўнага корпуса. Запрашаем усіх жадаючых.

А. САМУЙЛІЧ.

### «ГУЛЬНІ ДЛЯ ЗДАРОЎЯ»

— так называлася сустрэча спартыўных каманд БДУ і політэхнічнага інстытута. У праграму спаборніцтваў былі ўключаны турнір па міні-футболу, сустрэчы баскетбалістаў і валейбалістаў. Каманда БПІ стала пераможцай у спаборніцтвах валейбалістаў (мужчыны) і баскетбалістаў (мужчыны). А студэнты БДУ выйгралі турнір па міні-футболу і баскетболу (жанчыны). Пераможцам быў уручаны торт.

Але галоўная ўзнагарода — гэта румянец на шчоках і зарад бадзёрасці на ўвесь дзень.

В. РЭДЗЬКА.

# «Чакаю нечаканага...»

*адзін з нас*

...Цяжэй за ўсё, здавалася, было не напісаць навуковую працу, а выступіць. Не таму, што давялося вывучаць у кароткі тэрмін чужую мову — рабочай мовай Міжнароднай студэнцкай навуковай канферэнцыі краін — членаў СЭУ па спецыяльнасці «Электроніка і аўтаматызацыя», якая адбылася ў лістападзе ў Празе, была руская. Не з той прычыны, што недастаткова рыхтаваўся — яшчэ дома напісаў справаздачу, незлічоную колькасць разоў перачытваў, выкрэсліваючы лішняе, скарачаючы выразы, нават на памяць паспеў за гэты час вывучыць. Разумеў: амаль немагчыма за 5—10 мінут падзяліцца нават галоўнымі сваімі думкамі, таму вырашыў раскрыць толькі «самыя-самыя». Разлічваў: прыйдзе на дапамогу звычка размаўляць удвая хутчэй. Здаецца, прадумаў кожную дробязь.

Здарылася ж усё зусім не так, як меркаваў. Хваляваўся: міжнародная канферэнцыя ўсё ж! Не адразу знаходзіў трапныя і зразумелыя словы і выразы. Зразумелыя — дэталь немалаважная. Якая ж каму карысць ад справаздачы дзеля справаздачы? А ў зале сядзелі прадстаўнікі розных краін, і сапраўды цяжка было ім разабрацца. Прасілі гаварыць павольней. Таму давялося ўжо ў час выступлення ўсё перапрацоўваць...

Гэтая паездка ў Прагу была зусім нечаканай. Ва ўсякім выпадку, калі Дзмітрый Мельнік, зараз інжынер кафедры кібернетыкі радыёфізічнага факультэта, сустракаў мінулы Новы год, пра тое, што будзе ўдзельнікам Міжнароднай навуковай канферэнцыі, не здагадваўся. Даведаўшыся, спачатку разгубіўся. Адчуванне, што здарылася нейкая памылка, не пакідала яшчэ і ў першыя гадзіны канферэнцыі.

Спачатку прыслухоўваўся да выступленняў іншых удзельнікаў, прыкмячаў незвычайныя вынаходніцтвы, параўноўваў: а як у нас? Потым з «пасіўнага» слухача ператварыўся ў зацікаўленага. Задаваў пытанні, спрабаваў зазірнуць глыбей у сутнасць кожнай навуковай распрацоўкі. Здаецца, тады і зрабіў вывад: не святыя гаршкі лепяць. Дакладней, упэўніўся ў гэтым намнога раней. Яшчэ ў той час, калі яму, студэнту чацвёртага курса, асістэнт кафедры кібернетыкі Іван Аляксеевіч Шалатонін прапанаваў абраць тэму для курсавой работы.

— Ён «гарэў», калі працаваў у лабараторыі,— успамінае яго навуковы кіраўнік.

Падрыхтаваў курсавую, вырашыў ісці далей.

Тэма навуковай працы Дзмітрыя Мельніка гучала нязвыкла нават для тых, хто працаваў на кафедры — «Мікрапрацэсарная сістэма кіравання прывадам робата на базе рухавіка пастаяннага току». Зразумела, можна было займацца больш даследаванымі тэмамі: і літаратура ёсць, і практычныя распрацоўкі. Толькі ці сказаў бы Дзмітрый потым пра яе так, як гаворыць цяпер: «Мая работа»?

На маю думку, ён мае поўнае права лічыць яе сваёй. Не адзін вучэбны дапаможнік прачытаў, не адну навуковую працу даследаваў! Два гады, калі ўлічваць сучасныя тэмпы развіцця робататэхнікі, дастаткова доўгі тэрмін. Толькі не забывайцеся на тое, што распрацоўвалася тэма не на вялікім прадпрыемстве, а ў вучэбнай лабараторыі. Працаваў у час лабараторных заняткаў, пасля вучобы, часам нават з лекцый збягаў. Не думаў пра ўзнагароды — больш за ўсё цікавілі вынікі. Што атрымалася? Грунтоўная навуковая праца, па матэрыялах якой быў створаны універсальны стэнд для вывучэння мікрапрацэсарных сістэм кіравання робатам. У хуткім часе ён будзе дэманстравацца на ВДНГ БССР.

Наогул мінулы год прынёс у падарунак многа шчаслівых нечаканасцей Дзмітрыю Мельніку. Ён ажаніўся. Паспеў прыняць удзел у турыстычным падарожжы вакол Эльбруса. Быў выбраны камсоргам кафедры кібернетыкі. Што будзе ў наступным годзе? У адказ на гэтае традыцыйнае пытанне я пачула:

— Ніколі не загадваю наперад. Я чакаю, як заўсёды, нечаканага.

М. ЗАГОРСКАЯ,
наш кар.

НА ЗДЫМКУ: Дзмітрыя Мельніка віншуе з плённым 1986 годам гаспадар надыходзячага свята. Дзед Мароз гатовы таксама павіншаваць усіх чытачоў «Беларускага універсітэта», для каго мінулы год быў пленным.

Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

# «БУДЗЬЦЕ АПТЫМІСТАМІ!»

**Стала традыцыяй напярэдадні Новага года запрашаць у «Беларускі універсітэт» выпускніколў БДУ імя У. І. Леніна.**

**Сёння ў нас у гасцях выпускнік факультэта журналістыкі 1980 года, намеснік галоўнага рэдактара галоўнай рэдакцыі спартыўных праграм Беларускага тэлебачання і радыё Сяргей НОВІКАЎ.**

— Сяргей, ці успамінаеце сёння час вучобы ва універсітэце?

— Безумоўна. Студэнцкія гады памятныя кожнаму. Асабліва памятаецца тое, якім дружным быў наш курс у жыцці. Ніколі не забуду пра паездку з будатрадам на БАМ, працу на «бульбе». І, зразумела, спартыўныя спаборніцтвы. Зборная журфака па футболу, напрыклад, у той час пастаянна была ў ліку прызёраў агульнаўніверсітэцкай спартакіяды. І не выпадкова, што з нашага выпуску ў спартыўнай журналістыцы працуюць В. Саламахін, Д. Беленькі, А. Барысевіч, А. Басаў.

— А як вы прыйшлі да мікрафона?

— Яшчэ калі вучыўся на факультэце, я правёў свой першы рэпартаж. Гэта было на пятым курсе 9 лютага 1980 года. Тады ў спартыўнай рэдакцыі рэспубліканскага радыё і тэлебачання працавала старэйшына беларускай спартыўнай журналістыкі Фаіна Раманаўна Анціпава. І калі паўстала пытанне, каму весці адзін з першых гандбольных рэпартажаў у рэспубліцы, яна прывяла мяне, студэнта-практыканта, да галоўнага рэдактара У. Б. Шпітальнікава. Ен уважліва праслухаў плёнку з запісам майго пробнага, без эфіру, рэпартажу, а потым сказаў: «Усё зразумела, наперад!..» І я, вельмі хвалюючыся, першы раз сеў да мікрафона ў якасці спартыўнага каментатара.

— Вы шмат расказваеце аматарам спорту не толькі пра гандбол, але і пра футбол. А які від любіце больш?

— Я аднолькава люблю і футбол, і гандбол. Але калі ў адзін час на двух стадыёнах праходзяць гульні з удзелам мінскага «Дынама» і мінскага СКА — то я пайду на гандбол.

— Каму са сваіх калег у чымсьці падражаеце, у каго вучыцеся?

— Спартыўны рэпартаж, на мой погляд, павінен быць не толькі эмацыянальным, але і такім, каб спартыўны каментатар добра ведаў від спорту. Вось сярод такіх журналістаў адзначу: у футболе — Уладзіміра Пятрушына, у баскетболе — літоўскага каментатара Вяргілійюса Мундрыса, Сяргея Часкідава ў фігурным катанні.

— А якія найбольш памятныя рэпартажы за амаль 7 гадоў працы?

— Гэта рэпартажы з Чэхаславакіі з жаночага гандбольнага турніру па праграме спаборніцтваў «Дружба-84», якія мне даверыла весці Цэнтральнае тэлебачанне; таксама рэпартажы ЦТ з мужчынскага турніру гандбалістаў гульняў Добрай волі; і, зразумела, першы спартыўны рэпартаж Беларускага тэлебачання з-за мяжы, які я правёў у сакавіку 1983 года, калі ў паўфінале Кубка ўладальнікаў Кубкаў па гандболу сустрэліся «Волан» (Сегед, Венгрыя) і СКА (Мінск). І наогул як спартыўны журналіст я паважаю статыстыку. Падлічыў: правёў 321 рэпартаж, з іх 181 — тэле- і 140 — радыё.

Ваша прозвішча сустракаецца не толькі ў тэле- і радыёрэпартажах. Ведаю, што вы з'яўляліся аўтарам сцэнарыя фільма «Гуляючы, вер...», які на Усесаюзным кінафестывалі ў Рызе атрымаў першы прыз...

— Так. Імкнуся практыкавацца ва ўсіх відах журналістыкі, і нават у кіно. Гэта вельмі дапамагае мне ў асноўнай рабоце.

— А ці шмат у спартыўнага журналіста вольнага часу?

— Яго амаль няма. Спаборніцтвы круглы год. Але ўсё ж знаходжу час, каб пачытаць кнігі, і асабліва люблю гуляць са сваёй паўтарагадовай дачкой Верай, якая, дарэчы, ужо вельмі добра разбіраецца: гандбол ці футбол ідзе па тэлебачанню. Калі ўжо зайшла размова пра вольны час, то скажу, што ў мяне ёсць своеасаблівае захапленне: кожны год іду ў адпачынак 31 снежня. І на гэта не толькі аб'ектыўныя прычыны. Я вельмі люблю цудоўнае свята — Новы год!

## ФІЗКУЛЬТУРА І СПОРТ

# БІЯТЭАТР

### МАТЭРЫЯЛЫ І МЕТАДЫ

*Аб'ект даследавання.* Папуляцыя біёлагаў сфарміравалася ў раёне прывакзальнай плошчы Мінска, але ў час эксперыменту паспела змяніць месцазнаходжанне, замяніла хімічны фактар на радыёфізічны.

*Уздзеючы фактар.* Біятэатр.

*Методыка.* У якасці асноўнага метаду уздзеяння была выкарыстана дэманстрацыя са сцэны шэрагу псіха-фізіялагічных тэстаў, якім надавалася форма нэсс, балетаў, опер, аперэт, змешаных форм. Падлік інтэнсіўнасці смехавога адказу праводзілі з дапамогай рэгістратара ўзроўню шумоў з разрашаючай здольнасцю 100—1000 дэцыбелаў.

### ВЫНІКІ

ўздзеяння смехафактару на папуляцыю. У перыяд правядзення эксперыменту адбылося 28 актыўных уздзеянняў. Прапануемыя тэсты насілі тэматычны характар, і ў залежнасці ад пары года і самаадчування папуляцыі падраздзяляліся на пасвячальныя (асенні перыяд), віншавальныя (навагоднія і сакавіцкія), агульнасмехавыя і развітальныя (веснавы перыяд).

Вызначана, што ўзровень смехавога адказу вагаўся нязначна, але характар смеху вар'ірваў: ад ўрачыстага (восень) да сумна-дірычнага (май). З мэтай стабілізацыі характару і ў сувязі з загружанасцю падаследных усялякага роду заняткамі (вучоба, ДНД, членства ў добраахвотных таварыствах і г. д.) віншавальныя тэсты былі ў сярэдзіне эксперыменту выключаны, а развітальныя аб'ядналі з агульнасмехавымі.

Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на месцы правядзення эксперыменту. Як высветлілася ўжо ў самым пачатку, смехавыя запыты біёлагаў адносна высокія, таму і не ўмяшчаюцца ў актавай зале філалагічнага факультэта БДУ. З прычыны чаго ў далейшым выкарыстоўваліся клуб імя Дзяржынскага, кіназала, Палац культуры Белсаўпрофа і Палац культуры і спорту чыгуначнікаў. Аптымальнымі былі прызнаны ўмовы апошняга з пералічаных смехастэндаў, дзе і праводзілася большая частка эксперыментальных уздзеянняў.

Эфект і працягласць уздзеяння на дзве асноўныя групы папуляцыі некалькі адрозніваліся. Калі большая частка папуляцыі (студэнцкая) у цэлым праяўляла станоўчую рэакцыю, то сярод меншай, але больш значнай групы ужо на ранніх этапах высвятлялася неаднароднасць, што можа быць звязана як з асабістымі асаблівасцямі падвопытных, так і з канкрэтным зместам смехатэстаў.

Паколькі асноўным працэсам для даследуемай папуляцыі з'яўляецца навучанне, былі выяўлены некаторыя заканамернасці ўплыву смехавога ўздзеяння на наведванне і паспяховасць. Гэтыя паказчыкі ў перыяд эксперыменту няўхільна ўзрасталі. Вядома, што на гэтыя паказчыкі аказваюць уплыў шэраг фактараў, сярод якіх матэрыяльнае і маральнае стымуляванне займаюць асаблівае месца. Але не выклікае пярэчанняў, што фактар задавальнення смехазапытаў іграе рашаючую ролю.

*Эвалюцыя ўздзеючага фактару.* Біятэатр з'яўляецца ўздзеючым фактарам, але гэта не перашкаджае яму быць неадрыўнай часткай даследуемай папуляцыі. Гэты факт абумоўлены пастаянным далучэннем да справы біёлагаў, у якіх найбольш незадаволеныя смехазапыты.

У час эксперыменту даводзіцца асвойваць шэраг сумежных прафесій (драматурга, акцёра, рэжысёра і г. д.). Асноўным крытэрыем удзелу ў стварэнні смехатэстаў з'яўляецца поўная добраахвотнасць і ўменне не лічыцца са стратамі асабістага часу дзеля агульнай справы. З другога боку, змест усіх смехатэстаў арганічна звязаны з навакольнай рэчаіснасцю і незвычайнымі падзеямі, якія адбываюцца ў папуляцыі, вызначаюць, як правіла, напрамак і эфект уздзеяння.

Нягледзячы на актыўна-станоўчы ўплыў найбольш значнай групы папуляцыі, біятэатр прыступае да змены чацвёртага пакалення, захоўваючы пры гэтым свой твар. Трэба таксама адзначыць, што біятэатр пашырае свой арэал (узнікаюць філіялы ў інстытутах заалогіі, фізіялогіі, мікрабіялогіі і інш.).

Што патрабуецца для далейшай эвалюцыі біятэатра? Працяг эксперыменту, прыток новых сіл. Дамовіліся? Біятэатр чакае вас у новым годзе!

*нашы выпускнікі*

— Што пажадаеце напярэдадні Новага года нашым чытачам?

— Лічу, што маё пажаданне павінна быць звязана са спортам. Таму скажу, што Новы год — гэта заўсёды аптымістычны погляд на будучае. Няхай гэты аптымізм захоўваецца на працягу ўсяго года. А адна з галоўных умоў гэтага — сяброўства са спортам.

Інтэрв'ю правёў
А. ПУЦІЛА,
студэнт факультэта
журналістыкі.

## *МІМАХОДЗЬ*

*— Мой сабака мае такі розум, як і я.*

*— Гэта нуць яму ад вас не вельмі прыемна. Звычайна людзі хваляць сваіх сабак.*

*(Пераклад з чэшскай).*

# ЗВАНОК

Ноччу звоніць тэлефон.

— Іра?

— Так.

— Гэта я.

— Так.

— Праз хвіліну буду дома.

— Так.

— Яшчэ палова дванаццатага.

— Так.

— Можна да нас прывесці некалькі прыяцеляў?

— Так.

— Прыйдзем з гасцямі! Ты мяне разумееш добра?

— Так.

— Так?

— Так.

Муж замаўчаў, а праз хвіліну сказаў:

— Вельмі прашу дараваць, але я памыліўся нумарам тэлефона.

(Пераклад з чэшскай).

# СТУДЭНТ І КАТЫ

*Неяк раз, сабраўшыся, каты*
*Меркавалі пра свае хвасты.*
*— Вось мой хвост, казаў сібірскі кот,*
*Я ім вельмі-вельмі ганаруся,*
*Бо ніякага марозу не баюся.*
*— Я не з гэткіх велічных парод,*
*Сціпла мяўкнуў Баська з-за кутка,*
*Хвост мой лепшы, бо ён сябра ловаў —*
*Так, хвастом мышэй я забіваю.*
*— Пачакай, цябе я затрымаю,*
*Кот ангорскі Баську перабіў,*
*Я нічога болей не любіў*
*За свой хвост... Разам усе каты*
*Пачалі хваліць свае хвасты.*
*Вось, напэўна, крыку не ўняць!*
*Тут студэнт паблізу паказаўся,*
*Толькі што ён з лекцыі зматаўся*
*І ў інтэрнат ішоў, каб спаць.*
*Тармазнуў, пачуўшы гвалт катовы,*
*І павёў такую вось прамову:*
*— Я хачу дамовіцца, каты,*
*Памаўчыце пра свае хвасты!*
*Вас са мной ніяк не параўнаць —*
*У вас — адзін, а ў мяне — аж пяць!*
*Коцікі заціхлі, а студэнт дадаў:*
*— Мой першы хвост па рускай мове, раз!*
*Другі — я па гісторыі не здаў...*
*Пакуль далей студэнт пералічаў,*
*Павольна разбягаліся каты,*
*Хаваючы з вачэй свае хвасты.*
*Студэнт жа задаволены пайшоў:*
*«Я як-ніяк найлепшы за катоў».*
*Але праз месяц з-за пяці хвастоў*
*На цягніку вяртаўся ён дамоў.*

* * *

*Што лічыць кот сваёй ружовай марай,*
*То, ведайце, студэнту не да твару!*

# Гавораць, што...

...У 1987 годзе Французская Акадэмія навук заснавала прэмію таму, хто разгадае, чаму кату так шанцуе — ён заўсёды прызямляецца на чатыры лапы...

...чалавеку, якому гэтак жа шанцуе ў жыцці — Акадэмія за сакрэт яго шанцавання нічога не абяцала, бо, зразумела, яму і так усяго хапае...

...для Катоў ці Зайцоў (адпаведна па в'етнамскаму і японскаму календарам), народжаных у 1889, 1903, 1915, 1927, 1939, 1951, 1963 г., наступаючыя 12 месяцаў звяцца самымі плённымі, самымі светлымі, самымі [illegible] за мінулыя 12 гадоў [illegible] будучых. Напрыклад, тыя, хто нарадзіўся ў 1963 годзе, могуць без рызыкі спрабаваць паступаць на юрыдычны — лічыцца, што Кот добры юрыст, адвакат, натарыус...

Усім жа астатнім — Крысам, Змеям, Быкам, Тыграм, Малпам, Сабакам, Коням, Драконам, Козам, Пеўням, Свіням — хочацца заўважыць, што для іх наступаючы год будзе трохі мітуслівым, бо добразычлівыя перашкоды ў жыцці ўнясуць актывізаваныя Зайцы-Каты. І яшчэ: не спадзявайцеся на добразычлівае размяшчэнне нябесных свяціл. Зерце ў тое, што кожны з вас народжаны пад шчаслівай зоркай — вунь колькі іх на небе.

З Новым годам, паважаныя чытачы!

* Сёння ў кафэ «Гаўдэамус» пачнуць праходзіць факультэцкія перадновагодніх вечары для студэнтаў.

* 26 снежня ў кінатэатры «Піянер» адбудзецца традыцыйны навагодні вечар для супрацоўнікаў і выкладчыкаў універсітэта.

* 27 снежня ў інтэрнаце № 8 для нашых замежных сяброў будзе арганізавана святочная навагодняя ёлка.

* 2 студзеня 1987 года ў клубе камбіната сілікатных вырабаў — святкаванне Новага года. Праграма — цікавая. Запрашаюцца — усе.

«Смех — справа сур'ёзная», — заўважыў адзінокі А. Райкін. Але некаторыя аспекты фарміравання смеху, яго ўздзеяння на навучальны працэс, а таксама роля смехавога фактару ў фарміраванні адносін у сістэме «студэнт—выкладчык» да цяперашняга часу сур'ёзна не даследаваны. Гаворка пойдзе пра тое, як на біялагічным факультэце быў праведзены працяглы (у 10 гадоў) эксперымент, у ходзе якога і былі атрыманы вынікі, прапануемыя вашай увазе.

## Імгненні спадчыны

*УСПОМНІЦЕ, калі ласка, хутка якія-небудзь сем момантаў адыходзячага года. У кожнага з нас, напэўна, успышкай унутранага зроку ў тунелях памяці высветляцца самыя-самыя важныя эпізоды. Нам дарагія і блізкія яны. Без гэтай спадчыны старэючага цяпер ужо не па днях, а па гадзінах года, здаецца, немагчыма ўявіць сабе год будучы. І давайце, калі да бою Крамлёўскіх курантаў застанецца 5 мінут, успомнім яшчэ раз падарункі 1986 года.*

*Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.*

*Хто самыя вясёлыя, дасціпныя, знаходлівыя студэнты ва універсітэце? Зразумела, тыя, хто прымае ўдзел у КВЗ. Сёння мы бяром святочнае інтэрв'ю ў капітанаў каманд КВЗ фізічнага і механіка-матэматычнага факультэтаў. Вось якія пытанні прапанавалі мы ім.*

# Шэсць пытанняў капітанам

1. Што вас больш радуе: сесія ці свята Новага года?
2. Стыпендыя — гэта добра ці вельмі добра?
3. Што вы больш цэніце ў КВЗ: весялосць ці знаходлівасць?
4. Павінен джэнтльмен павіншаваць даму з Новым годам, калі ён рабіў гэта летась?
5. Ці магчыма асвятляць вуліцу ведамі?
6. Вашы навагоднія пажаданні чытачам газеты «Беларускі універсітэт» і вашым саперникам.

Мікола Яраш, малодшы навуковы супрацоўнік кафедры ядзернай фізікі, капітан каманды КВЗ фізфака:

1. Зразумела, свята Новага года, таму што сваю апошнюю сесію я здаў пяць гадоў назад.
2. Стыпендыя — гэта добра, але пастаянная зарплата ўсё ж лепш.
3. У КВЗ я больш за ўсё цаню тое, што гэта — клуб.
4. Сапраўдны джэнтльмен павінен віншаваць не адну даму...
5. Калі розум светлы, то магчыма.
6. Жадаю студэнтам малодшых курсаў, каб у новым годзе яны мелі магчымасць чытаць «Беларускі універсітэт», а не якую-небудзь іншую газету, студэнтам V курса — каб усе дайшлі туды, куды іх паслалі, і каб ім там спадабалася. Саперникам жадаю, каб рыхтаваліся лепш, мы з імі жартаваць не маем намеру.

Аляксандр Даражынскі, студэнт II курса, капітан каманды КВЗ механіка-матэматычнага факультэта:

1. Больш за ўсё мяне радуе

# ПАРСЮКІ...

*фельетон*

— Глядзі, Коля, зноў урну з хлебам да смецціправода панеслі.

— Ну дык што з таго, у нас так амаль усе робяць, чаму тут здзіўляцца?

(З размовы ў калідоры інтэрната № 2).

УСЁ ГЕНІЯЛЬНАЕ павінна быць простым. Вы сумняваецеся? Тады звярніцеся да бабулі Насты. Яна паведаміць вам гісторыю, якая здарылася нядаўна ў інтэрнаце № 2. Чаму, запытаецеся, там? А тут жыве яе любімы ўнучак, студэнт Вова.

— ...Ты ўжо пастарайся, а мы з маці нічога не пашкадуем, толькі вучыся, выбівайся ў людзі,— настаўляла яго бабка, спрытна завіхаючыся ля стала.

Незнарок яна змахнула на падлогу кавалак хлеба. У той жа момант унучак падхапіў яго і ўкінуў у ўрну. Старая аслупянела.

— А што тут такога,— усміхнуўся ўнук.— Гэта ж не твая вёска, тут скарміць няма каму.

— Як гэта няма каму? — разгубілася бабуля.— Колькі ж дабра прападае. Вас жа вунь колькі, гаўрыкаў. Расцілі б кабанчыкаў. Бытоўка, сам казаў, пустая.

Унук доўга рагатаў над такой нечаканай прапановай. А потым залямантаваў:

— Бабулька, хопіць пра гэта. Нічога, кажу, змяніць нельга. Так ужо тут з даўніх часоў вядзецца. А пажартавала ты добра, як у анекдоце.

Ты таксама смяешся, чытач, над бабчынай прапановай? Але ж яна па сутнасці тая самая геніяльная ідэя, якую і патрэбна ажыццявіць у нашым інтэрнаце. Табе смешна? Але пачакай. У нашым выпадку апошняе слова вось за якімі цікавымі падлікамі.

У інтэрнаце № 2 жыве каля тысячы чалавек. Уявім, што кожны дзень добрая палова з іх бярэ хлеб. Атрымліваецца больш за паўтоны. А праз кароткі час частка яго трапіць у смецціправод. За месяц — каля 100 кілаграмаў хлеба будзе вывезена на звалку. А за год? Жах уявіць. Гэта па самых сціплых падліках! А колькі такіх інтэрнатаў ва універсітэце!

Паважаны, пачакай, прадбачу рэпліку: усё, маўляў, гэта і без цябе даўно вядома. Вось і выхад са становішча раяць зусім просты: паставіць на паверхах інтэрнатаў кантэйнеры для харчовых адходаў. Але пакуль што дырэкцыя студгарадка чамусьці не хвалюецца за вырашэнне гэтай наспеўшай даўно справы.

# «Сустракаю Новы год у Саюзе»

*слыніца — азірнуцца*

Новы год разам з савецкімі студэнтамі сустрэнуць студэнты-замежнікі нашага універсітэта. Яшчэ адзін год у Савецкім Саюзе праляціць для іх. Елка новага — 1987 года — стане для адных апошняй у нашай краіне, а для другіх — толькі першай. Студэнтка I курса факультэта журналістыкі Валянціна КУНЦЭВІЧ гутарыла з замежнымі студэнтамі напярэдадні Новага года пра тое, што было, ёсць і што будзе ў іх жыцці.

*Міраслаў ЮКЛ, студэнт IV курса аддзялення філасофіі гістарычнага факультэта, кандыдат у члены КПЧ, актыўны член чэхаславацкага земляцтва:*

Мінулы год не быў для мяне чымсьці асаблівым. Гэта быў звычайны год студэнта з яго няжкасцямі і радасцямі. І нагул, як дарэчыць удалы год ад няўдалага? Мабыць, удалы той, на працягу якога чалавек дабіваецца таго, чаго жадаў у пачатку года, узнімаецца на нейкую вышэйшую ступеньку? Але каб адчуць гэта, трэба, напэўна, жыць на бязлюдным востраве, удалечыні ад усіх штодзённых праблем. А чалавеку, загружанаму жыццёвымі клопатамі, вельмі часта не хапае часу на тое, каб падумаць пра гэта і пра іншыя важныя рэчы, і гэта вельмі дрэнна. Але я адчуў, што час вучобы ва універсітэце не праходзіць дарэмна, калі летам адпачываў дома, у Чэхаславакіі.

Што асабліва запомнілася мне ў мінулым годзе? Напэўна, летняя паездка ў Ленінград. Гэта было вельмі-вельмі здорава. Ленінград такі ж прыгожы горад, як і Прага. А белыя ночы — гэта ж проста цуд!

Я не знайшоў новых блізкіх сяброў, але і не згубіў старых, а гэта вельмі важна ў жыцці чалавека — мець добрых таварышаў. Пашанавала таксама ў тым, што ў мяне вельмі чулы навуковы кіраўнік курсавых работ М. А. Мажэйка, цудоўны чалавек і выкладчык.

Што датычыць планаў на будучы год, то я збіраюся перастаць быць такім нудным і «драўляным», як зараз (тут ужо ён несправядліва да сябе.— В. К.). Ну а калі гаварыць сур'ёзна, то зараз усе думкі пра наступны год звязаны з зімовай паездкай дамоў для праходжання грамадска-палітычнай практыкі.

*ЭНРЫКА СІЛЬВА МАЛЕС, студэнт з Нікарагуа, які ў 1987 годзе скончыць механіка-матэматычным факультэт:*

— Мінулае навагоднее свята нікарагуанскія юнакі сустракалі разам, і агульнае для ўсіх жаданне было — хутчэй скончыць вучобу і вярнуцца на радзіму. Вельмі хочацца прыехаць дамоў да святкавання гадавіны рэвалюцыі, каб у гэты ўрачысты дзень быць разам з суайчыннікамі. Але няма ў мяне тугі па радзіме, бо пасля пяцігадовага тэрміну вучобы ў вашай краіне я адчуваю сябе сярод савецкіх людзей амаль як дома. Моўнага бар'еру практычна няма. Я ў Савецкім Саюзе апошні год, і таму імкнуся і буду старацца жыць як мага цікавей, хадзіць у тэатры, кіно, музеі. Нядрэнна было б пабываць у іншых гарадах краіны, бо дагэтуль быў толькі ў Маскве. А яшчэ — Энрыка ўсміхаецца — хачу як мае быць запомніць снег, і вельмі шкадую, што ў бліжэйшыя гады змагу бачыць яго толькі ў халадзільніку...

# «КОЛЕР РАДАСЦІ, ШЧАСЦЯ, МІРУ»

Было ўжо позна, калі я стомлена адчыніла дзверы свайго пакоя і... ахнула. Пад столлю з аднаго вугла ў другі былі працягнуты гірлянды з дожджыку, які зіхацеў і пераліваўся ўсімі колерамі. На парозе стаяла ўсміхнёная суседка па пакоі Мэры. Першая думка: «Няўжо заўтра трэцяцы першае?!» Мэры здагадалася і, весела засмяялася:

— НЕ, ДА НОВАГА ГОДА яшчэ трэба пачакаць!

Потым Мэры Ісігуза, якая вучыцца разам са мной на факультэце, наліваючы гарбату, прапанавала:

— Хочаш, раскажу, як у нас, у Нігерыі, адзначаюць Новы год? Новы год у Афрыцы ўявіць табе нялегка, гэта амаль тое самае, што здаць сесію ў свята Новага года. А калі сур'ёзна, дык як і ўсіх — Новы год.

2. Стыпендыя — гэта не вельмі добра, а ўсяго толькі добра, таму што мала.

3. Вясёлую знаходлівасць.

4. Я лічу, што павінен, і не адзін раз у год.

5. Калі ведалі аб асвятленні (адукацыі, асвеце), тады магчыма.

6. Арганізатарам КВЗ я жадаю, як гаварылі нашы сапернікі-фізікі, каб універсітэт запаланіла хваля КВЗ, але каб ён у ёй не захлынуўся. Чытачам жадаю быць весялейшымі.

І таму зноў з дня ў дзень паглынаюць пражэрлівыя ўрны кілаграмы народнага здабытку.

А наша бабуля Наста тым часам выбралася ў калідор, каб ехаць дадому. Раптам сутыкнулася з дзяўчынай, якая выносіла смецце, паверх яго віднеліся кавалкі хлеба. Рукі бабулі неяк самі па сабе выхапілі іх адтуль.

— Вы што гэта, бабка?.. Зграладаліся?

— Не хвалюйся, унучка, усё добра, а вось у вас... — Яна не паспела дагаварыць, як адзін са студэнтаў пракрочыў міма іх да смецціправода і панадкусаныя белыя булкі з шумам панеслі ўніз. Унук іранічна ўсміхнуўся (каторы ўжо раз), гледзячы на гэта.

— Вось...

— Пачакай, пачакай, унучак, дай ужо даказаць,— прыпыніла яго бабуля.— Я ўпачатку, здаецца, памылілася. Не патрэбны вам сапраўдныя парсюкі ў бытоўках, іх і так даволі...

*ДУМКА У АДЗІН РАДОК*

*Не зайздросце людзям, якія маюць усё, яны ніколі ад сэрца не плачуць.*

*Многія маладыя людзі вылятаюць з роднага гнязда на бацькоўскіх крылах.*

*(Пераклад з чэшскай).*



У ЛІФЦЕ: А. МАКСІМАЎ — фельетаніст, Крылова любіць С. СУЛКОЎСКІ, ён жа і А. ГАРШКОЎ бралі першае ў жыцці капітанаў КВЗ інтэрв'ю, у біятэатр агітаваў А. ПЕСНЯКЕВІЧ, абвесткі да ёлкі прыляпіў Ю. САБАСЦЯН, мастацкія здольнасці прадэманстраваў В. ЯЦКОЎСКІ. У ЛІФТ пускала А. ВІХРОВА.

*сяміца — азірнуцца*

## ...а як святкуюць у нас?

Напрыклад, пятнаццацігадовыя супраць дваццацігадовых.

Нашу гутарку працягвае студэнтка V курса факультэта журналістыкі Алмаз Амэр, якая прыехала да нас з Эфіопіі:

— У нас год складае 13 месяцаў, кожны з іх налічвае 30 дзён. Новы год у Эфіопіі адзначаюць 1 верасня, па нашаму календару цяпер на маей радзіме 1979 год. У святкаванні ў нас свае звычаі. Да прыходу гэтага дня людзі набываюць па магчымасці новую вопратку, новыя рэчы або мэблю ў кватэру. У кожнай сям'і выпякаюць вялікі круглы бохан хлеба, які ўпрыгожваюць яйкам і разынкамі. Свята праходзіць часцей за ўсё ў доме бабуль і дзядуль, куды збіраюцца ўсе дзеці. Старэйшыя апранаюцца ва ўсё белае, таму што гэты колер у Эфіопіі — сімвал чысціні і радасці. Усе садзяцца вакол стала і чакаюць, пакуль бацька або старэйшы ў сям'і разрэжа хлеб на роўныя часткі, тады яго можна будзе з есці з гарачым кофе.

Размова працягвалася. Я ўважліва слухала, і ўсё, што мне гаварылі, добра разумела. Разумела не толькі таму, што студэнты, з якімі гаварыла, нядрэнна ведалі рускую мову, але і таму, што шмат, згадзіцеся, вельмі шмат падобнага ў тым, як усе мы святкуем Новы год! І вельмі дарэчы прагучалі словы малійскай студэнткі Маймуны Траорэ:

— У Новы год мы збіраемся ўсе разам, — каб паціснуць адзін аднаму рукі і больш ніколі не сварыцца паміж сабой.

Давайце ж збярэмся ўсе разам у гэту навагоднюю ноч і горача паціснем адзін аднаму рукі: няхай будзе мір ва ўсім свеце, няхай забудуць удовы воднае адзенне сіроцтва; няхай пануе на Зямлі колер радасці, чысціні і шчасця!

Т. ХУДОБА,
студэнтка факультэта журналістыкі.

нашы інтэрв'ю

# «Год пражыты не дарэмна!»

Гавораць, пад Новы год усялякае здараецца. Магчыма, што каму-небудзь з нас давядзецца ўбачыць самага сапраўднага Дзеда Мароза. Нават паразмаўляць з ім.

Калі б у навагоднюю ноч Дзед Мароз сустрэў на вуліцы Алега Георгіевіча Слуку і спытаў, чым быў знамянальны для яго 1986 год, Алегу Георгіевічу знайшлося б што расказаць. Алег Георгіевіч у гэтым годзе выбраны на пасаду дэкана факультэта журналістыкі, які сам скончыў у 1968 годзе, паспяхова абараніў доктарскую дысертацыю.

— Алег Георгіевіч, Вы памятаеце свой першы студэнцкі Новы год? Якім ён быў?

— Вельмі добра памятаю. Вясёлым і шчырым. Гэта быў баль-маскарад на філфаку. Чамусьці знікла зараз на многіх факультэтах гэтая цудоўная традыцыя — сустракацца пад Новы год на маскарадзе. А шкада... Калі б я быў студэнтам зараз, ад новага года чакаў бы прасторы, размаху для дзейнасці, каб паспрабаваць сябе на грамадзянскую, маральную трываласць. У дваццаць гадоў — самы раз уваходзіць смела ў жыццё.

— Што Вы асабіста чакаеце ад новага года?

— Чалавеку трэба актыўна дзейнічаць, а не чакаць, калі праблемы вырашацца самі. У новым годзе я маю жаданне ўпарта папрацаваць над вырашэннем праблем факультэта журналістыкі.

— Якія змяненні чакаюць факультэт?

—Усе змены будуць звязаны з выкананнем на справе рашэнняў XXVII з'езда, праекта ЦК КПСС аб перабудове вышэйшай школы. Акрамя гэтага, вельмі хочацца атрымаць памяшканне для факультэта. Вось каб аддалі нам Дом палітвучобы...

Але ж перамены немагчымы без галоўных іх удзельнікаў — студэнтаў. Хачу бачыць іх актыўнымі ўдзельнікамі перабудовы вучэбна-выхаваўчага працэсу, заўзятымі і ўпартымі ў авалоданні сваёй прафесіяй.

— Уявіце сабе, што ў Новы год вы сталі Дзедам Марозам, які мае чароўную сілу. Якія б падарункі Вы прынеслі студэнтам?

— Студэнтам журфака — Дом журналіста, дзе было б усё для жыцця і адпачынку, для развіцця асобы, здольнасцей і таленту: дысплеі, басейны, літаратурныя і мастацкія гасціныя, тэле-кафэ. У гэтым бы доме збіраліся, дзялілі ся сваімі думкамі, сустракаліся з цікавымі людзьмі. А студэнтам астатніх дзесяці факультэтаў шчыра хачу пажадаць не ненавідзець душой, не спыняцца на паўдарозе ў пабудове ўласнай асобы і жыцця, у выхаванні актыўнай жыццёвай пазіцыі. Каб у канцы будучага года можна было ўпэўнена сказаць: «Год пражыты не дарэмна!»

Гутарку правяла
А. СУПРУНОВА,
студэнтка факультэта
журналістыкі.

памяць

*НА СУСТРЭЧУ да студэнтаў III курса гістарычнага факультэта прыходзіў былы начальнік штаба 64-й арміі, якая абараняла Сталінград, генерал-лейтэнант у адстаўцы Іван Андрэевіч Ласкін.*

*Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.*



# Грамадзянскі абавязак

17 снежня ў Калоннай зале Дома саюзаў адбылася ўстаноўчая канферэнцыя Усесаюзнай арганізацыі ветэранаў вайны і працы. У наш час узнікла неабходнасць напоўніць яшчэ больш актуальным зместам існуючыя формы ўдзелу ветэранаў у эканамічным і грамадска-палітычным жыцці грамадства, а таксама ўвесці ў дзеянне новыя. Гэтым мэтам і павінна служыць створаная Усесаюзная арганізацыя.

УДЗЕЛ ВЕТЭРАНАЎ вайны і працы ў ваенна-патрыятычным і працоўным выхаванні моладзі, яе ідэйна-маральнай загартоўцы — сёння галоўны грамадзянскі абавязак людзей старэйшых пакаленняў — гэтыя словы старшыні арганізацыйнага камітэта сакратара ЦК КПСС Г. П. Разумоўскага датычаць і нас, выкладчыкаў вышэйшай школы. Выключна вялікае значэнне мае выхаванне пачуцця грамадзянскага абавязку ў савецкай моладзі.

Вывучаючы слаўныя старонкі баявых і працоўных будняў савецкіх людзей, успамінаючы тых, хто абараняў Маскву і Ленінград, штурмам авалодаў Берлінам, студэнцкая моладзь яшчэ глыбей пачынае разумець, якая вялікая адказнасць кладзецца на плечы кожнага маладога чалавека ў справе ўмацавання эканамічнай і абароннай магутнасці нашай Радзімы, усёй сацыялістычнай садружнасці, за захаванне міру на Зямлі.

Пачуццё грамадзянскага абавязку выхоўваецца ўсёй сістэмай вучэбнай і пазавучэбнай работы. Для гэтага ў нас ва універсітэце ёсць магчымасці. Тут працуе звыш 100 прафесараў і дацэнтаў, якія актыўна ўдзельнічалі ў баях Вялікай Айчыннай вайны. Сярод іх 24 загадчыкі кафедраў: Б. П. Баркоўскі, Р. В. Булацкі, А. А. Галаўко, С. Р. Драбязка, А. В. Дулаў, А. С. Кляўчэня, А. А. Лабуда, М. У. Піскуноў, Т. І. Прытыцкая, І. Д. Прахарэнка, М. В. Рожын, М. Т. Раманоўскі, А. М. Русакова, І. С. Сямыкін, Р. Л. Старобінец, І. Р. Цішчанка, І. С. Цішкевіч, В. Ф. Чыгір, Л. М. Шакун, П. П. Шуба, А. М. Шырокаў, М. Я. Цікоцкі, М. Р. Юркевіч, С. Я. Янчанка.

Напярэдадні свята Новага года жадаю ўсім ветэранам вайны і працы моцнага здароўя, далейшага плённага ўдзелу ў выхаванні студэнцкай моладзі, трывалых грамадзянскіх перакананняў.

І. МАРЧАНКА,
старшыня савета ветэранаў універсітэта.

## Станіслаў Атамановіч

### Навагодні лес

Прыйдзі ў чароўны зімні лес,
Калі змяняюцца гады.
Прыйдзі, глядзі: на неба ўзлез
Іскрысты месяц малады.

Сцяжынку ён праклаў к табе
У сузор'ях зінеўшых бяроз.
Вісяць ільдзінкі на вярбе:
Павесіў іх стары Мароз.

Нябачны спеў гучыць з крыніц,
Страляе ў вогнішчы смала...
Апоўнач... Звоны ў цішыні...
Прыгледзься: казка надышла.

### Папараць-кветка

Як папараць-кветку, шукаю цябе я,
Імкнуся пазнаць паміж рэх-галасоў.
Жыву я адзінай нязгаснай надзеяй —
Знайсці цябе ў процьмах дрымучых лясоў.

Нялёгкімі сцежкамі пушчу праходжу —
У балотах я вязну, блуджу ў хмызняках.
Усюды шукаю — нідзе не знаходжу
Я папараць-кветкі ў забытых кутках.

Калі ж павалюся на мох у знямозе,
Заплюшчыўшы вочы, заплачу наўзрыд,
Зоркаю яснаю ў сне ты прыходзіш.
Вочы раскрыю — знікае прывід.

А можа не трэба шукаць і змагацца?
Хай без мяне яна дзесь зацвіце.
А можа спыніцца, а можа застацца?!
Вунь колькі кветак прыгожых расце!

Толькі вось сэрца гарыць апантана,
Шчасце цяжкога шукае сабе.
Толькі цябе назаву я каханай,
Шчасцем сваім назаву я цябе.

## Уладзімір Сіўчыкаў

### Запісная кніжка

Скураны пераплёт маёй кніжкі,
Нумары, нумары, нумары...
Супрацоўнік газеты А. Ніжнік
42-27-33.

Тэлефоны, што не адгукнуцца
Ці адкажуць: дом мод, магазін...
Святаслаў Літвіновіч са Слуцка
5-32-01.

Як імёны губляюцца проста,
Што запісаны спешна ў метро...
546-23-90 —
Ленінградзец Мікола Вятроў.

Вандраванні, сустрэчы, размовы...
Хіба ездзіў я ў Слуцк ці Мсціслаў?
Забыццё, нестрыманыя словы...
Хто яны — Мікалай, Святаслаў?

Дый маё імя ў нейкіх блакнотах
Засталося, як даўні білет.
Ды няшчадна, забыты ў турботах,
Выкасоўваецца гэты след.

### Сябру

Над гудронна-нямым небакраем
Поўня коціцца ў зорны прасцяг...
У спагадна-бяссонных начах
Крэўных рытмаў і слоў прычакаем.
На спрадвечных айчынных мурах
Найтрывалага грунту шукаем
І з надзеяй у збалелых вачах
У мінуласць лісты адсылаем,
Як абвесткі няўдач, перамог,
Ды ствараем умовы-каноны,
Каб паспець зруйнаваць іх да скону.
Пашыбуем да ўласных дарог,
Праспяваўшы «Купалінку»-песню,
А няўдачы чырвоным закрэслім.

### Поўнач

*З начнога сада хвалямі ідзе*
*Салодкі пах лістоты прэлай. Кроны*
*Застылі ў чуйнай цемры. Над бяздоннем*
*Размытай соннай плямай кагадзе.*

*Дыск поўні пакаціўся, дзе-нідзе*
*Далёкія агні зіхцяць натхнёна.*
*Мінуў чарговы неацэнны дзень.*
*Задумлівы і сцішаны з балкона*

*Я крочыў у паўсветлены пакой.*
*Стары гадзіннік са сцяны па звычцы*
*Час падганяе боем меладычным.*

*Чакаюць у кватэры гарадской*
*Зялёна-жоўты абажур таршэра,*
*Пісьмовы стол, алоўкі, стос паперы.*

# «АСНЕЖАНЫЯ РЫТМЫ»

«Снегу няма, а рытмы будуць!» — нетрадыцыйнымі словамі адкрыў традыцыйны вечар паэзіі Алег Антонавіч Лойка, прафесар, паэт, кіраўнік літаб'яднання «Узлёт».

*ТАК ПАЧАЛОСЯ СВЯТА. А паколькі ніякае свята не абыходзіцца без кветак, апранутыя ў нацыянальныя касцюмы дзяўчаты-філфакаўкі жывымі гваздзікамі павіншавалі гасцей нашага факультэта і яго былых выпускнікоў, вядомых паэтаў — Анатоля Вярцінскага, Галіну Каржанеўскую, Міколу Мятліцкага. Дарэчы, прадставіла гасцей прысутным таксама паэтэса, дацэнт кафедры беларускай літаратуры Любоў Канстанцінаўна Тарасюк.*

*Каля трох соцень спакушаных юнацкіх душ прагна ўбіралі ў сябе кожнае паэтычнае слова Галіны Каржанеўскай. А чытала Галіна Анатольеўна кранаючыя вершы пра пекнату мясцін роднай Случчыны, пра каханне, пра сваіх былых вучняў (паэтэса сем гадоў працавала ў школе).*

*Амаль засыпалі пытаннямі студэнты Анатоля Вярцінскага, якому, як рэдактару «ЛІМа», больш давялося гаварыць прозай пра свае працоўныя будні. У прыватнасці, Анатоль Ільіч паведаміў нам, як «свежы вецер перамен» паляпшае надвор'е ў сучаснай беларускай літаратуры. Заўважна пацяплела ў зале пасля праслухоўвання вершаў паэта, некаторыя з якіх мы ведаем па песнях.*

*Вельмі эмацыянальна знаёміў слухачоў з вершамі свайго новага зборніка «Мой дзень зямны» Мікола Мятліцкі — лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі за 1986 год. Яго вершы вызначаюцца грамадзянскай пафаснасцю, тэмпераментам, навізной вобразаў.*

*Відаць, запомніліся прысутным і выступленні пачынаючых паэтаў-«узлётаўцаў». Са сваімі вершамі выходзілі на сцэну студэнты філфака Алена Сторажава, Іна Яцухна, Галіна Ракоца, Алесь Бадак, а таксама аспірант кафедры беларускай літаратуры Сяргей Кавалёў. Мяркуючы па доўгіх апладысментах, вечар удаўся. Слова падзякі за ўвагу ад імя паэтаў выказала Галіна Каржанеўская.*

*На нашым факультэце кожнае пачынанне добрай справы мае ўчэпістыя карані. Колькі было цікавых вечароў, шчырых размоў, памятных сустрэч толькі за тры апошнія гады! Колькі вядомых літаратараў перагасціла ў актавай зале філфака! Рыгор Барадулін, Іван Навуменка, Сяргей Грахоўскі, Вячаслаў Адамчык, Генадзь Бураўкін, Генадзь Кісялёў, Сяргей Законнікаў, Вольга Іпатава, Раіса Баравікова, Уладзімір Някляеў, Аляксей Дударай, Міхась Стральцоў, нядаўнія вышэйназваныя госці... І трэба спадзявацца, гэты спіс-пералік кожны год будуць падоўжваць новымі цікавымі імёнамі новыя ініцыятыўныя студэнты.*

Ж. ПАХАДНЯ,
студэнтка філалагічнага
факультэта.


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

25 снежня 1986 года

АТ 07777. Зак. 1525.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 72-73.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ.